✓ **9 сакавіка** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася публічная лекцыя **«Статуты ВКЛ у кантэксце гісторыі права Беларусі».** Экспертам выступіў кандыдат гістарычных навук, загадчык кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Уладзімір Падалінскі. На лекцыі абмеркавалі ролю і змест статутаў Вялікага Княства Літоўскага, якія з'яўляюцца не толькі першымі фундаментальнымі зборамі прававых нормаў і выдатнымі творамі юрыдычнай думкі, але і найважнейшымі помнікамі старабеларускай мовы. Менавіта дзякуючы першаму (1529), другому (1566) і трэцяму (1588) статутам ВКЛ увайшло ў кола дзяржаў, у якіх права стала важным элементам рэгулявання грамадскага і дзяржаўнага жыцця.

*да Года гістарычнай памяці*

# Уладзімір Падалінскі

## Статуты ВКЛ у кантэксце гісторыі права Беларусі



*9 сакавіка 2022 г.*




*Цыкл публічных лекцый вядомых навукоўцаў "Крыніцы гістарычнай памяці"*